# НА ПАКЛОН ДА ЯНКІ КУПАЛЫ

**10 чэрвеня дэлегацыя Саюза пісьменнікаў Беларусі наведала малую радзіму Янкі Купалы.**

Гродзеншчыну прадстаўлялі члены Саюза пісьменнікаў Беларусі Тамара Мазур і Людміла Кебіч, а таксама лаўрэат Першага рэспубліканскага літаратурнага конкурсу сярод маладых паэтаў імя Міколы Мятліцкага Дзіяна Траццяк.

Паэты ўсклалі вянкі і кветкі да помніка песняру ў Вязынцы, наведалі яго музей і душэўна пагутарылі пра купалаўскую спадчыну за салодкім сталом, накрытым гаспадарамі.

**Тамара МАЗУР**

**На фота:** Купалаўскі мемарыяльны запаведнік «Вязынка» (Маладзечанскі раён, Мінская вобласць). 10 чэрвеня 2023 года.






**Д. Трацяк, Л. Кебіч, Т. Мазур**


РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ
ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЯ
КАШТОЎНАСЦЬ
КУПАЛАЎСКІ
МЕМАРЫЯЛЬНЫ ЗАПАВЕДНІК
"ВЯЗЫНКА"–
РАДЗІМА Я.КУПАЛЫ
ПРЫЧЫНЕННЕ ШКОДЫ АБО ЗНІШЧЭННЕ
КАРАЕЦЦА ПА
ЗАКОНЕ


25 чэрвеня ст.ст. 1882
у гэтай хаце
нарадзіўся
Янка Купала
-народны паэт
Беларусі




DZIADY
Янка Купала
СОН НА КУРГАНЕ
Янка Купала
Курган
HUŚLAR






ЯНКА КУПАЛА

XXII НАЦЫЯНАЛЬНЫ ФЕСТЫВАЛЬ БЕЛАРУСКАЙ ПЕСНІ І ПАЭЗІІ
Маладзечна-2023
9 і 10 чэрвеня

# І МЫ ТАМ БЫЛІ...

**Дэлегацыя Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі прыняла ўдзел у Нацыянальным фестывалі беларускай песні і паэзіі «Маладзечна – 2023».**

10 чэрвеня ў рамках Нацыянальнага фестывалю песні і паэзіі ў Маладзечне ў шыкоўным Палацы культуры адбылася літаратурна-музычная гасцёўня пад назвай «Радзіма маяміралюбная», дзе Гродзеншчыну прадстаўлялі члены Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэты Тамара Мазур, Людміла Кебіч, Валянцін Семяняка, а таксама Дзіяна Трацяк, лаўрэат Першага рэспубліканскага літаратурнага конкурсу імя Міколы Мятліцкага сярод маладых паэтаў.

Гледачамі дзеі сталі людзі розных узростаў, якія па-сапраўднаму любяць беларускую паэзію, і таму не скупіліся на апладысменты за кожны верш і песню. Будзем ведаць, што наш самы шчыры чытач жыве ў Маладзечне — горадзе-калысцы роднай мовы і беларускасці. Што і не дзіўна, бо нацыянальны фестываль вытрымаў тут высокую планку ўжо ў 22 раз.

**Тамара МАЗУР**

**На фота:** падчас літаратурна-музычнай гасцёўні пад назвай «Радзіма мая міралюбная» ў межах Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі «Маладзечна – 2023». 10 чэрвеня 2023 года.

**Яшчэ пра падзею – тут:**

http://www.oo-spb.by/index.php?id=4750

http://www.oo-spb.by/index.php?id=4751

http://www.oo-spb.by/index.php?id=4752

https://goo.su/qkAp7rZ

XXII НАЦЫЯНАЛЬНЫ ФЕСТЫВАЛЬ БЕЛАРУСКАЙ ПЕСНІ І ПАЭЗІІ
Маладзечна-2023
9 і 10 чэрвеня




**Пасля цырымоніі ўзнагароджання лаўрэатаў Першага рэспубліканскага літаратурнага конкурсу імя Міколы Мятліцкага сярод маладых паэтаў**




**ля мікрафона лаўрэат Першага рэспубліканскага літаратурнага конкурсу імя Міколы Мятліцкага сярод маладых паэтаў Дзіяна Трацяк (Гродна)**






**Паэтэса Тамара Мазур**




**Т. Мазур, Л. Кебіч, Д. Трацяк**



Дзяржаўны, палітычны дзеяч, беларускі паэт Валянцін Семяняка




Паэтэса Таццяна Атрошанка (Маладзечна)